ТЭЛЕПРАГРАМА НА НАСТУПНЫ ТЫДЗЕНЬ – на 3-й старонцы

Свабода, роўнасць, братэрства!




Беларускі Усход

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Заснавана ў 1991 годзе №5 (61). Субота, 31 ліпеня 1999 г. У розніцу кошт 10000 руб.

БАЗАРЫ: ДЗЕ, ШТО, ПАЧЫМ

N п/п	Тавары	Цэны ў тысячах рублёў, у нядзелю 25.07.99 г.				
		Хоцімск	Касцюковічы	Крычаў	Чэрыкаў	
					базар	джзярж. магазін
1	Гуркі, кг	50-60	40	80	100	—
2	Памідоры, кг	350	350	350	330	390
3	Капуста, кг	60	60	80	100	130
4	Бульба, кг	150	150	130	135	—
5	Яблыкі, кг	—	—	—	250-270	—
6	Цукар, кг	155	150	138	150-170	—
7	Мёд, 1 літр	1500	1800	—	—	—
8	Алей, 1 літр	440-450	440-450	500	—	—
9	Яйкі, 10 шт.	150	150	150	—	—
10	Грэчка, крупы, кг	—			390	187
11	Рыс, кг	—			260	280
12	Макаронныя, кг	—			180	200
13	Свініна, кг	500-550	500-600	500-540	500-600	—
14	Пара парсюкоў	5-7 млн.	10 млн.	10 млн.	10 млн.	—
	у тым ліку: свінячка	2-3 млн.	4 млн.	4 млн.	4 млн.	—
	кабанчык	3-4 млн.	6 млн.	6 млн.	6 млн.	—
15	1 даляр (на чорным рынку)	450-480	—	—	—	—



Від на раку Сож. Фота В. Бысава.

Навіны, падзеі, факты

Новы хлеб пайшоў!

Яшчэ ў пачатку гэтага тыдня Касцюковіцкі хлебапрыёмны пункт прыняў у дзяржаўныя засекі першыя 172 тоны добрага зерня новага ўраджаю. З калгаса "Радзіма" паступіла 83 тоны збожжа, ад хлебаробаў "Дубровы" – 73 тоны, з "Кранштадта" – 16 тон.

Самі гаспадаркі сёлета сваім транспартам хлеб не возяць у Касцюковічы. Сюды зерне дастаўляецца цэнтравывазам. Ажыццяўляюць яго аўтамабілісты райаграпрамтэхэнерга і аўтабазы N 8.

С. ПАРХОМЕНКА.

Механізатары стараюцца

Як паведаміў дырэктар саўгаса "Трасціно" Хоцімскага раёна, у гаспадарцы склалася нялёгкае становішча. Яшчэ нядаўна тут было каля двух дзесяткаў зернявых камбайнаў, сёлета ж у наяўнасці толькі 10. Прычым самыя "новыя" адпрацавалі ўжо па 5-7 год. У выніку штодзённа працуюць у полі 8 камбайнаў, а два — на прафілактычным рамонце. І ўсё ж настрой аптымістычны. Механізатары стараюцца. Не падводзіць пакуль і надвор'е. Зерне з бункераў на ток паступае з 15 працэнтнай вільготнасцю. Сушыць не трэба. Адразу ідзе на ачыстку.

Аднак ураджайнасцю кіраўнік гаспадаркі незадаволены. Азімая пшаніцы з насеннага поля дала ўсяго 20 цэнтнераў, а жыта і таго менш —10 цэнтнераў з гектара.

Вельмі ўжо сёлета засушлівы год. У траўні прайшоў толькі адзін добры дождж. А ў чэрвені, у самае цвіценне і пры наліве збажыны стаяла спякота да 34-39 градусаў у ценю. І за ўвесь месяц — ні кроплі дажджу.

Па стану на 27 ліпеня ў саўгасе зжата і абмалочана 10 адсоткаў пасеваў зернявых. Калі надвор'е не сапсуецца — збожжа будзе ўбрана ў сціслыя тэрміны.

(Наш кар.)

СВЕДЕНИЯ
о ходе сельскохозяйственных работ по состоянию на 28 июля 1999 года

Районы	Зерновые и зернобобовые	
	убрано в % к плану	урож., ц/га
Белыничский	20	14,7
Бобруйский	27	18,7
Быховский	24	15,1
Глусский	24	15,4
Горецкий	14	24,9
Дрибинский	20	15,9
Кировский	32	20,0
Климовичский	14	11,0
Кличевский	28	12,9
Костюковичский	25	11,5
Краснопольский	26	12,2
Кричевский	9	15,7
Круглянский	22	18,9
Могилевский	36	15,5
Мстиславский	10	17,3
Осиповичский	31	15,1
Славгородский	24	17,2
Хотимский	15	10,2
Чаусский	19	13,4
Чериковский	12	18,7
Шкловский	16	21,4
По области	21,3	16,1
Было на 28.07.98 г.	2	24,6

Жніво набірае тэмпы

Масавая ўборка зернявых ідзе па ўсёй краіне. Па тэрмінах яна апярэджвае мінулагоднюю на 10-12 дзён. На Брэстчыне палескія раёны ўжо зжалі ад 30 да 40 адсоткаў збожжавых. Але графік уборкі на Палессі парушылі навальнічныя дажджы. Ёсць праблемы і з палівам.

Што датычыцца ўраджайнасці, то сёлета яна ніжэй леташняй. Па вобласці пакуль сабралі ў сярэднім па 22 цэнтнеры з гектара.

Арыштаваны контрабандысты

20 ліпеня літоўскай пагранічнай паліцыяй на Урэляйскім пагранпункце Шальчынінскайскага раёна арыштаваны двое грамадзян Беларусі, якія спрабавалі тайна правезці праз мяжу 200 тысяч долараў ЗША і 200 грамаў золата. Гэтыя каштоўнасці былі схаваны ў паветраным фільтры і пад абіўкай дзвярэй іх аўтамабіля "Вольва-850". Па факту кантрабанды ўзбуджана крымінальная справа. Прозвішчы арыштаваных у інтарэсах следства не выдаюцца.

Пераплюнулі Данію

У міліцыю ў нашай краіне зараз у 10 разоў больш супрацоўнікаў, чым у Даніі, па колькасці насельніцтва роўнай Беларусі.

Стыль кіраўніцтва

За мінулы, 1998 год, па падліках былога суддзі Канстытуцыйнага Суда, прафесара М.Пастухова, кіраўніка Цэнтру прававой абароны СМІ, прэзідэнт РБ выдаў 24 дэкрэты і 620 Указаў. І сёлета А.Лукашэнка актыўна кіруе Дэкрэтамі ды Указамі.

Ці хопіць у беларускай апазіцыі сіл змагацца за ўладу

(Радыёперахват беларускай праграмы радыё "Свабода")

Паваротны дзень 21-га ліпеня адышоў ў гісторыю. Уздым народных гулянняў змяніўся вяртаннем да рэальнасці. Прэзідэнт праведзены, Аляксандр Лукашэнка застаўся. Апазіцыя падлічвае новыя штрафы і падлечвае раны. Так, юрыст Алег Волчак, які на мітынгу 21-га ліпеня звярнуўся да міліцыі з заклікам пераходзіць на бок народа і не служыць далей незаконнай уладзе, быў па-зверску збіты. Каб заглушыць ягоныя крыкі, у Маскоўскім аддзяленні міліцыі Мінска была ўключана гучная музыка.

* * *

Вярхоўны Савет так і не даў дагэтуль адказу, да каго ж пераходзіць канстытуцыйная ўлада на Беларусі? Хіба што адзінай выніковай акцыяй, даведзенай да канца, стаў учынак беларускага Пушкіна, мастака, які ў якасці ўдзячнасці першаму Прэзідэнту прыкаціў да ўваходу ў ягоную адміністрацыю вазок з гноем. Алесь Пушкін арыштаваны і знаходзіцца пад следствам.

* * *

Палітолаг Уладзімір Мацкевіч заявіў, што 21-га ліпеня дае нам падставы зараз не падпарадкоўвацца указам Прэзідэнта, бо лічыць тое, што ён робіць, законным, легітымным далей нельга. Ды і ці дасць нам Бог сілы і волі, каб выконваць гэтыя намеры, гэта ўжо іншая справа.

* * *

Журналіст Аляксандр Старыкевіч выказаў думку на радыё "Свабода" так:

— Адгэтуль любыя міжнародныя пагадненні, якія падпіша рэжым Лукашэнкі, не маюць юрыдычнай бездакорнасці. І таму — цяперашняе плануемае стварэнне Саюзнай дзяржавы можа быць у любы момант аспрэчана.

* * *

А вось меркаванне журналіста Юрыя Дракахруста:

— Як ні горка нам гэта канстатаваць, цуда, на мой погляд, не адбылося. Не адбылося таго, аб чым пісаў Шарэцкі, шмат хто з журналістаў, што прыдзе 21-га ліпеня і Лукашэнка стане простым калгаснікам, Лукашэнка ж працягвае трымаць у сваіх руках уладу, як ні ў чым не бывала.

* * *

Трое сяброў дэмакратычных арганізацый Барысава правялі выхадныя дні пасля вядомых гулянняў у пастарунку, чакаючы судовага разбіральніцтва за ўдзел у гэтых гуляннях і мітынгах.

* * *

Дзеянні апазіцыі не прынеслі нейкага важкага поспеху. У гэтым ёсць як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя прычыны. Аб'ектыўныя прычыны ў тым, што беларуская апазіцыя практычна адсунута ад рэальных рычагоў улады. І не толькі ў палітычным сэнсе, але і эканамічна. Яна не мае эканамічнай базы. Да таго ж сказваецца і пазіцыя Расіі, бо пэўныя ўплывовыя колы гэтай краіны яўна падтрымліваюць рэжым Лукашэнкі і выкарыстоўваюць яго для ўласных мэт. І трэці фактар — гэта палітыка Захаду. А менавіта зніжэнне зацікаўленасці, тым, што адбываецца ў Беларусі, з боку заходняй грамадскасці.

Аб'явы

Для работы ў рэдакцыі газеты "Беларускі Усход" тэрмінова патрабуюцца вопытныя журналісты на пасады рэдактараў (можна па сумяшчальніцтву), карэспандэнцкіх пунктаў у Чэрыкаве, Горках, Шклове, Бялынічах, Асіповічах і Глуску, прадаўцы газеты ў розніцу ў тых жа гарадах і раёнах, а таксама ў Хоцімскім, Касцюковіцкім і Клімавіцкім раёнах, **спрактыкаваныя аператары камп'ютарнага набору і вёрскі газеты, рэкламныя агенты.** Прэтэндэнты залічваюцца ў штат рэдакцыі пасля выканання выпрабавальнага задання па прафесіі, на якую прэтэндуюць.

З заявамі звяртацца да галоўнага рэдактара. Даведкі па тэлефонах: 8-247-22-9-89 і 8-247-22-0-09 (для жыхароў Хоцімскага раёна — 22-9-89 і 22-0-09).

***

Працягваецца падпіска на газету "Беларускі Усход" з любога чарговага месяца. Напамінаем, што падпісны кошт на газету да 1 кастрычніка застанецца нязменным: на 1 месяц — 32 тысячы рублёў, на 2 месяц — 64 тысячы, на тры — 96 тысяч. Калі вы ў ліпені і жніўні месяцы да 20 чысла аформіце падпіску да канца года на 4 месяцы, то заплоціце ўсяго 128 тысяч рублёў. А калі на той жа тэрмін аформіце ў верасні, то ўжо значна даражэй, бо з пачаткам падпіскі на чацвёрты квартал падпісны кошт узрасце на 50 адсоткаў, гэта значыць, што падпіска на адзін месяц з 1 кастрычніка будзе каштаваць 48 тысч рублёў, а на чацвёрты квартал (тры месяцы) —144 тысячы. Падпісаўшыся на "Беларускі Усход" ў жніўні да канца года (на 4 месяцы) вы зэканоміце 48 тысяч рублёў.

Спяшайцеся на пошту і выпісвайце "Беларускі Усход" да канца года!

Рэдакцыя.

Актуальны каментар

ЗАХОДНІЯ СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ МЯНЯЮЦЬ ТОН У АЦЭНКАХ СІТУАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

Шырока разрэкламаваная ў апазіцыйнай і заходняй прэсе дата 20 ліпеня ўжо мінула, аднак, чаго і трэба было чакаць, яна не ўнесла істотных змен у расклад сіл на беларускай палітычнай арэне. Аляксандр Лукашэнка па-ранейшаму застаецца кіраўніком дзяржавы і не збіраецца ўступаць свае паўнамоцтвы лідэрам апазіцыі, чые прэтэнцыёзныя, але малаэфектыўныя дзеянні не знаходзяць шырокай падтрымкі ў грамадскім асяроддзі. Зыходзячы з існуючых рэалій, заходнія лідэры і сродкі масавай інфармацыі пачынаюць мяняць тон у ацэнках грамадска-палітычнай абстаноўкі, якая склалася ў Беларусі.

Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць і паведамленне агенцтва "Рэйтэр", перададзенае 19 ліпеня пад характэрным загалоўкам — "У беларускага лідэра пачынаецца тэрмін "яго прадоўжаных паўнамоцтваў". Раней гэта агенцтва, як і большасць іншых сродкаў масавай інфармацыі Захаду, у сваіх матэрыялах гаварыла толькі аб "заканчэнні пяцігадовага тэрміну, на які быў выбраны прэзідэнт Беларусі".

"Як у краіне, так і за яе межамі знойдзецца няшмат людзей, якія могуць сур'ёзна ўплываць на намеры Лукашэнкі застацца ва ўладзе яшчэ на два гады", — канстатуе "Рэйтэр". Паводле меркавання выдання, нягледзячы на недавер да Аляксандра Лукашэнкі, Захад працягвае мець справу з існуючай уладай праз пасрэднікаў з АБСЕ. Прадстаўнікі гэтай арганізацыі заяўляюць аб абяцанні прэзідэнта, што парламенцкія выбары, якія пройдуць у Беларусі ў наступным годзе, будуць свабоднымі і справядлівымі, і што ён будзе весці перагаворы з апазіцыяй. У сітуацыі, якая склалася, заходнім лідэрам прыходзіцца задавольвацца тымі гарантыямі, якія гатовы прадставіць ім прэзідэнт.

"Неафіцыйныя прэзідэнцкія выбары, што былі арганізаваны апазіцыяй у маі і мелі на мэце процідзеянне прадаўжэнню Лукашэнку тэрміну прэзідэнцкіх паўнамоцтваў, прыцягнулі да сябе толькі невялікую цікавасць грамадскасці", — піша аўтар артыкула.

Такім чынам, заходнія сродкі масавай інфармацыі, відаць, паступова схіляюцца да пункту гледжання, выказанага, акрамя іншых палітычных дзеячаў, старшынёй Савета Федэрацыі Расіі Ягорам Строевым. "Сітуацыя з тэрмінам паўнамоцтваў прэзідэнта Беларусі —справа народа рэспублікі", —заявіў ён у інтэрв'ю сродкам масавай інфармацыі Расіі 21 ліпеня.

БЕЛТА.

НІШТО НЕ ВЕЧНА У СВЕЦЕ

Нельга зважаць увагу на беларускі, у апошні час, акцэнт нашага прэзідэнта, бо ён прышоў сюды як чалавек Расіі. Усе ягоныя памкненні, усе яго інтарэсы толькі ў Расіі. Ягоная найпершая мэта —гэта прыйсці да расейскай улады, аддаўшы за гэта Беларусь. Гэта абсалютна ясна з усіх яго дзеянняў з самага першага дня яго знаходжання ў якасці прэзідэнта нашай рэспублікі. І таму ўся тая праца, якую ён правёў напрацягу свайго прэзідэнцтва, гэта тое ж самае, што рабіў колішні губернатар пасля таго, як было разбіта паўстанне Каліноўскага. Толькі ў яго сродкі больш вялікія і большыя магчымасці ёсць: і тэлебачанне, і прэса, і вертыкаль, і ўлада, сілавыя структуры. І ўсё гэта накіравана на знішчэнне ўсяго беларускага. Што можа ўтрымаць гэту "беларускасць"? Толькі маральнасць народа! Толькі яго высокія духоўныя якасці! Таму менавіта на ўдушэнне гэтага была накіравана ўся дзейнасць дзікай машыны ўлады. Тое, што мы атрымалі сёння, гэта перш за ўсей запалоханы чалавек, гэта кожны дзень нагнятанне нейкага такога звярынага страху. І людзі баяцца ўсяго, баяцца страціць работу, баяцца выказацца ўголас, баяцца выйсці ў горадзе на вуліцу на якую дэманстрацыю, таму што па ўсёй вуліцы стаяць людзі ў камуфляжы. Чаму міліцыя была перапранута ў камуфляж? Камуфляж— гэта форма, якую надзяваюць пад час вядзення баявых дзеянняў. Прэзідэнт ведае, што ў беларусаў высокасвядомае вайне, таму наўмысна стварэецца ўражанне, што з хвіліны на хвіліну пачнецца вайна з НАТА і таму слухайце, слухайце ўсё, сканцэтрыруйцеся вакол прэзідэнта, які вас абароніць ад гэтай вайны. І вось таму была створана такая атмасфера, што маральнасць стала нечым чужародным. Стаўка рэжыму на тое, каб чалавек быў пазбаўлены маралі абсалютна. У кіраўніка дзяржавы — калгаснае выхаванне. Мы гэта не павінны забываць. Увесь час працавала ідэалагічная машына савецкага саюза на стварэнне новага чалавека. Яна іго стварыла. Узор новага чалавека — гэта ён. І вось гэтымі савецкімі поглядамі, з бальшавіцкай агрэсіўнасцю, з калгасным вопытам, ён прышоў да практычна неабмежаванай улады. Ён робіць абсалютна тое ж, што рабіў старшыня калгаса, каб усе людзі працавалі па яго ўказцы. І таму ніякіх адхіленняў няма і цяпер ад гэтай генеральнай лініі.

Усё тое, што робіцца цяпер на Беларусі, проста незразумела. Я ўвесь час думаю, як магло здарыцца, што ў еўрапейскай краіне, у цэнтры Еўропы раптам вось гэткае дзікунства, сярэдневяковая азіятчына. Аказваецца, робіцца нейкая духоўная ізаляцыя гэтай краіны. Еўропа як бы не заўважае, бо сорам мець у Еўропе гэткую краіну. Нейкія такія шырмачкі вывешваюцца: вы бачыце, чалавек прышоў да ўлады легітымна, бачыце, яго падтрымлівае народ.

А хіба мы ведаем, як змяняліся ўяўленні гэтага народа аб уладзе? Хто калі праводзіў якія слушныя апытанні? Тое, што зараз праводзіцца на вуліцах, калі страчаюць чалавека і пытаюць:

— Вы падтрымліваеце гэты рэжым?

А ён ведае, што калі скажа "не падтрымліваю" — што пасля гэтага будзе з ім. Можа страціць работу, можа ў вёсцы не атрымаць каня, калі яму спатрэбіцца, можа яшчэ што-небудзь здарыцца. Таму мы ніякіх уяўленняў не маем пра настрой народа. І вось гэты гвалт доўжыцца, доўжыцца і ён будзе доўжыцца бясконца таму, што створаны ўнікальныя ўмовы для існавання вось гэтага нейкага сярэдневечнага рэжыму.

Я назіраю за нашым грамадствам ужо не адно дзесяцігоддзе. Я ведаю, што было, калі пачыналіся пагромы беларускай інтэлігенцыі ў 70-я і 80-я гады. Якая рэакцыя грамадства была на гэта і што зрабілася цяпер. Адбыўся выбух беларускасці. Фарміруецца ўрэшце беларуская нацыя. Ёсць людзі, якія гатовыя ісці да канца за Беларусь. Я ніколі не быў прыхільнікам тэорыі, што народ — гэта нейкая большасць насельніцтва. Ні ў якім разе. Народам можа быць усяго толькі жменька сапраўдных людзей, як гэта неадночы паказвала гісторыя чалавецтва. Але гэтыя людзі бяруць на сябе адказнасць за лёс сваёй краіны, за лёс будучыні. І яны перамагаюць. І таму я веру, што ўсё тое, што было зроблена ў апошнія гады, усе тыя людзі, якія праз гэтыя жахі, праз гэтыя бойкі, праз гэтыя турмы, праз гэтае дзікунства ішлі непахісна, яны прыйдуць да свабоднай нармальнай цывілізаванай дэмакратычнай Беларусі. Гэты шлях незваротны. І таму існуючы рэжым на Беларусі не вечны. Усё роўна ён скончыцца. І скончыцца тым, чым павінны скончыцца. Лавай падсудных. Людзі, якія яму дапамагаюць, павінны сёння думаць і ведаць пра тое, што рана ці позна адказнасць наступіць.

Уладзімір ХАЛІП.

А вы чулі пра гэта?

Хочаш быць здаровым — ажаніся

Быць халасцяком — шкодна для здароўя. Да такога вываду прыйшлі вучоныя Амерыкі і Фінляндыі. Па іх даследаваннях, удаўцы, разведзеныя мужчыны і закаранелыя халасцякі падвержаны дачаснай смерці ў два разы часцей, чым жанатыя мужчыны. Аднак "жанацік" "жанацікў" таксама не раўня. Мужчыны, незадаволеныя сваім шлюбам, паміраюць раптоўнай смерцю на 80% часцей, чым мужы, якія атрымліваюць асалоду ад шлюбу.

Калі жаніцца? Калі займацца каханнем?

Белыя ламы Тыбета не раяць уступаць у шлюб (распісвацца ў ЗАГСе ці вянчацца) і займацца каханнем (уступаць у палавыя кантакты) у наступны час.

Панядзелак: 03.30—07.00; 17.15 —20.45. Аўторак: 07.00 — 10.30; 17.15 — 20.45. Серада: 07.00-10.30; 20.45 — 24.00. Чацвер: 10.30 — 13.45; 20.45—24.00. Пятніца: 0.00—03.30; 10.30 — 13.45. Субота: 00.00 — 03.30; 13.45 — 17.15. Нядзеля: 03.30 —07.00; 13.45 — 17.15.

Адзенне і жаночы розум

Група італьянскіх медыкаў правяла даследаванні матэматычных здольнасцей юнакоў і дзяўчат спачатку, калі тыя былі апранутымі, затым — распранутымі. Абследаваліі самі здзівіліся. Аказалася, што колькасць і якасць адзення надзетага, або зняйтага з цела мужчыны ніяк не ўплывае на яго кемлівасць. А вось у жанчын актыўнасць мозгу прама прапарцыянальна ступені прыкрытасці цела. Дзяўчаты ў бікіні пагалоўна атрымлівалі двойкі, бо не маглі рашыць самыя простыя задачы. Чаму? Ды таму, што напаўаголеная дзяўчына прагрэсіўна страчвае здольнасць да канцэнтрацыі, паколькі захоплена думкамі пра тое, як яна выглядае, якое ўражанне стварае на процілеглы пол і на канкурэнтак, адзначылі медыкі.

Дзіўнае лякарства

Пацыент праглынуў тэрмометр, калі медсястра адной з бальніц Анкары хацела змераць у яго тэмпературу. У турэцкіх бальніцах для вызначэння тэмпературы цела градуснік кладуць у рот. Малады рабочы-будаўнік, магчыма, не ведаў пра гэта. У адказ на пытанне, куды ён падзеў градуснік, пацярпеўшы здзіўлена прамармытаў: "Дзіўнае лякарства, вельмі цяжка глытаць".

Глядзіш тэлевізар — грызі моркву

Даследаванні амерыканскіх спецыялістаў паказалі, што празмернае захапленне тэлевізарам у 5-10 разоў павялічвае патрэбнасць у вітаміне А. Яго недахоп выклікае "курыную слепату".

Калі мы глядзім тэлевізар больш як тры гадзіны ў дзень, то павінны рэгулярна з'ядаць свежую моркву. Ужо 75 г яе ўжытай са смятанай забяспечвае дзённую патрэбу дарослага чалавека ў вітаміне А. Багатыя на гэты вітамін таксама пячонка, малако, яйкі, пятрушка, зялёная цыбуля, памідоры і абрыкосы.

Ці ёсць геніі ў канцы XX стагоддзя?

У горадзе Тэлен жыве **Расіта Мендоса**. У 2,5 гады яна навучылася чытаць. У 3 гады прачытала першую кніжку — раман Ж.Санд "Кансуэла". У 7 гадоў закончыла мясцовы коледж. Зараз Расіта вучыцца на трэцім курсе матэматычнага факультэта ўніверсітэта Буэнас-Айрэса. Яна свабодна гаворыць па англійску, вывучае французскую і японскую мовы. Дзяўчынка марыць пасля заканчэння ўніверсітэта паспрабаваць свае сілы на дыпламатычнай рабоце. А пакуль, прыйшоўшы дадому пасля лекцый, Расіта з задавальненнем гуляе ў лялькі.

Нас шальмуюць..

Пастаянная перадазіроўка "блакітнага экрана" прыводзіць да павышэння ўнушальнасці, праграміравання паводзінаў, выпрацоўкі шаблоннага мыслення, зніжэння працаздольнасці. Так што ўсё добра ў меру. А ўздзеянне адмоўных энергій экстрасенсаў тэлевізійная сістэма ўзмацняе ў 25-30 тысяч разоў.

Паводле слоў члена-карэспандэнта НАН Г.Р. Маншына, зараз вядзецца інфармацыйная вайна супраць народаў рэспублік, якія раней уваходзілі ў састаў СССР.

Ідзе інфармацыйна-псіхалагічная апрацоўка насельніцтва, агрэсіўная і разбэшчаная інтэрвенцыя праз электронныя СМІ, накіраваная на змяненне менталітэту, развенчанне маральных каштоўнасцяў.

Беларусаў шальмуюць праз расійскія газеты і тэлевізійныя праграмы, расіян — праз украінскія і беларускія (не ўсе, вядома).

Аблічча не змянілася

Галадранцы, якімі былі да 1917 года, такімі і засталіся: працаваць не хочуць і стварыць не здольныя. Затое зайздрасць у іх —знішчальная. Прычым зайздросцяць менавіта тым, хто працай і розумам нажывае багацці і даруюць злодзеям і тым, хто жыве за кошт чужой працы, бо і самі крадуць. Праўда, па дробязі — абы на чарку!

По матэрыялах друку. Падрыхтаваў наш кар.

Добры дзень, "Беларускі Усход"!

Піша Вам малады чалавек, які зараз шукае работу. Гэты ліст мяне прымусіла напісаць тое, што адбываецца вакол нас і чаго мы не заўважаем ці не хочам заўважаць. Ну, вось, хоць бы гэта, як жывуць нашы старэнькія пенсіянеры. Як яны сваімі нямоглымі рукамі носяць ваду вельмі здалёку, з даўно нячышчанага закінутага калодзежа, як на згорбленых плячах носяць дровы з суседніх хмызнякоў. Я пражыў на роднай беларускай зямлі толькі 18 год, а ўжо паспытаў нямала знявагі і прыніжэння чалавечай годнасці ад нашай так званай улады, якая выкліпала мяне на камісію непаўналетніх. Але я ўсё сцярпеў і яшчэ многае сцярплю, толькі вось не магу спакойна глядзець, як нашы бабулі і дзядулі адпрацаваўшы па паўвека, а то і больш на зямлі, большай часткай задарма, за нейкі кол-працадзень, страціўшы сілы і здароўе, а многія яшчэ мужоў і дзяцей у гады ВАВ, у Афгані, паклаўшыя маладосць на алтар Айчыны дзеля таго, каб нам, цяперашнім, жылося добра, каб мы не ведалі голаду і вайны, а цяпер яны састарыліся, занемаглі і атрымліваюць жабрацкую пенсію ў нейкіх шэсць мільёнаў зайчыкаў, дзешавейшых за колішнія керанкі. Як ім жыць? Добрага жыцця, светлай будучыні, што ім усё жыццё ўлады абяцалі, яны так і не дачакаліся. На ашчадных кніжках грошы ў іх укралі.

Захацелася мне бліжэй пазнаёміцца з жыццём на вёсцы і я паехаў у адну з нашых Клімавіцкіх глыбінак. Сустрэў там бабулю Мар'ю, якая несла на плячах ношку сена сваёй "матулі". Так ласкава яна заве кароўку.

— Бабуля, колькі Вам год? —спытаў я.

— Мне ўжо 87 год, — адказала старэнькая.

— А ў вас ёсць дзеці? — пытаюся.

— Ды ёсць, но яны раз'ехаліся і ня пішуць дажа. Ды я і чытаць усё раўно не вмею. С 9 лет работала. Палола калхозныя паля, касіла сена і ўсё эта нам платілі за 12 часов работы у день па 15 капеек. У тоя урэмя нам жылося трудна, но весялей было. На работу — с песнямі, з работы — с песнямі. Была надзежа што в старасці жіть будет лягчэй, будзем жыць в достатке. А жівём не дай Боже як...

— Пенсію ж Вы атрымліваеце?

— Ды палучаю шэсць мільёнаў. Ды пашти сразу в перший день и расходую: давги раздам, куплю нешта в крами... штраховку заплачу и все грошы. А ты завидуеш пенсии...

Мне яна многае расказала, як ім дрэнна на вёсцы жывецца, як цяжка апрацаваць соткі на прысядзібным участку, якая марока знайсці каня. А калі знойдзеш, то трэба бутэлькі несці. А потым жа яшчэ ўбраць трэба.

— Я аджыла свой век. А вот як вы будете жить?

Вось-вось, — пытаюся я сябе, —як будзем жыць? Можа яшчэ горш, чым сённяшнія пенсіянеры?

На каго ж думаюць абаперціся цяперашнія ўлады? Можа на студэнтаў, якія не могуць знайсці работу на канікулах, альбо на рабочых, якія месяцамі не атрымліваюць заробкаў? Не, ад нас яны падтрымкі не дачакаюцца...

Ліст з заўвагамі рэдакцыі

Я прайшоў па вёсцы і мяне здзівіла, як нас падманьваюць улады, трызняць па тэлеку, пішуць у газетах, што жыццё на Беларусі самае лепшае, калі параўнаць з астатнімі рэспублікамі былога СССР.

Аказваецца, ўсё гэта брахня. Як мне сказалі, у вёску прыязджае толькі два разы на тыдзень аўтамагазін. А цэны перавышаюць усялякія нормы. Мясцовая ж вертыкаль не паклапоціцца хоць бы раз у год праведаць людзей, паглядзець, як яны жывуць. На развітанне бабуля Мар'я сказала:

Не ведаю, ці надрукуеце вы хоць трэцюю частку майго ліста. Толькі мне здаецца, ваша газета чэсная. Я не люблю чытаць газеты, бо ў іх наша жыццё паказваецца ў ружовым святле, а Вашу прачытаў з задавальненнем. У ёй усё канкрэтна і зразумела.

У мяне ёсць шмат матэрыялаў, аб тым, як нас усюды і заўсёды падманьваюць, што ў Клімавічах ужываюць наркотыкі...

І яшчэ праз Вашу газету мы (а гэта ўсе мае сябры) хацелі б звярнуцца да нашага Прэзідэнта. Мы — маладое пакаленне. І нам будучыню трэба будаваць. І працаваць у поце твару на нашай роднай беларускай зямлі. Няўжо мы таксама, як нашы бабулі і дзядулі будзем марыць па забяспечанаю старасць, а дажыўшы да пенсіі апынёмся ў такім жа становішчы, як і яны? У такім разе успомнім, што

"Никто не даст нам избавленья — Ни Бог, ни царь и ни герой. Добемся мы освобожденья. Своею собственной рукой".

20.07.99 г. Г.С.П. г. Клімавічы.

Заўвагі рэдакцыі

Рэдакцыя, як бачыце, не "пабаялася", змясціць Ваш ліст, малады чалавек, з невялічкімі скарачэннямі, хоць ён і ананімны. У далейшым раім паведаміць сваё імя і адрас. Рэдакцыя павінна ведаць, хто нам піша. Калі ж вы не жадаеце свой твор падпісваць уласным прозвішчам, то прыдумайце сабе псеўданім ці даверце рэдакцыі гэта зрабіць. Але дакладны адрас, прозвішча і сваё імя абавязкова ўказвайце. Інакш друкаваць не будзем. Гэты ж Ваш ліст мы змясцілі таму, што апісаны Вамі малюнак не адзінкавы. Яго можна назваць тыповым для ўсёй Беларусі. І не толькі...

Программа телевидения

ПОНЕДЕЛЬНИК, 2 августа

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.15 Новости.
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина.
9.25 "Сегодня с вами..."
9.50 Здоровье.
10.15 "Я рисую".
10.30 "Все дело в шляпе".
11.10 Новые имена.
11.20 "Верность любви".
12.05 Теленавигатор.
12.25 Музыка без границ.
13.15 Фильм-сказка "Огненный стрелок" ("Беларусьфильм").
14.35 "Романсы".
15.00 Новости.
15.15 "Боишься ли ты темноты?"
15.40 "Доктор Айболит". Мультфильмы 1 — 3-й.
16.10 Сельчане.
16.35 Авто-парк.
16.45 Премьера песни.
17.15 "А музыка звучит..."
17.35 "Выбирая гимнастику, выбираю судьбу".
18.10 "Верность любви".
18.50 Новые имена.
19.15 Политические диалоги.
19.40 МСН.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Женщина в белом". Телевизионный худ.фильм.
23.05 "Триумф с Кристиной Орбакайте".
23.35 Криминальная хроника.
23.40 Белорусский хит-парад.
23.45 Третий тайм.

ОРТ

13.30 Программа "Вместе".
14.00, 17.00, 23.10 Новости.
14.15 "Гарри — снежный человек".
14.40 "Ну, погоди!"-10.
14.50 Звездный час.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 "Графиня де Монсоро".
18.15 Программа "Мы".
18.55 "Мисс Марпл".
20.00 Время.
20.45 Боевик "В зоне особого внимания".
22.25 "Взгляд".
23.25 Фильмы Луцика и Саморядова "Гражданин убегающий", "Канун".

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия!
9.10 "Миледи".
10.00, 16.00, 19.00, 23.35 Вести.
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 Башня.
16.55 "Лето нашей тайны". Сериал.
17.55 Дежурная часть.
18.30 Почта РТР.
19.45 Криминальная драма "Нежный обман" (США).
21.30 "Эдита Пьеха на "Площади звезд".
23.20 Дежурная часть.
0.05 Мастер-ралли-99.
0.20 Магазин на диване.

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 "Маленький принц". Худ. фильм.
8.30 "И.-С.Бах. Страницы жизни и творчества".
9.20 "Алые маки Иссык-Куля". Худ. фильм.
10.55 Книжный кладезь.
11.10 Поклонникам Терпсихоры.
11.40 После новостей...
12.00 "Консилиум".
12.25 Фольклорный фестиваль.
12.35 Возвращение Саши Соколова.
13.00 Страна Фестивалия.
13.45 "Цунами".
14.45 Живое дерево ремесел.
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 Мультфильмы .
16.00 "Православие на телевидении". "Звонарь".
16.35 15-й подъезд.
17.00 "Мир авиации".
17.27 Анонсы.
17.40, 19.50 А.Н.Островский. "Не все коту масленица". Спектакль Малого театра.
19.05 Мультипликационные фильмы.
19.15 Чудо-сказка.
20.45 После новостей...
21.05 "Алые маки Иссык-Куля". Худ. фильм.
22.40 "Pro memoria".

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
7.35 Я — телохранитель.
8.10 "Она написала убийство" (США).
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.20 "Чистосердечное признание".
9.45 Своя игра.
10.15 Мультфильм.
10.25 Дог-шоу. "Я и моя собака".
11.30 "Операция "Трест", заключительная серия.
13.35 Добро пожаловать!
14.20 Сегоднячко.
15.30 "Захватчики".
16.25 Впрок.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" НА БТ

13.15 Пунктир.
13.45 Телелоцман.
14.05 Мультфильмы.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Солдат удачи, ЛТД": спецназ".Телесериал.
18.15 К юбилею поэтессы Н.Ковалевой.
18.30 Мультфильм.
18.40 Бобруйский вариант.
19.00 Тяжелый день.
19.30 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 Наше старое кино. "Доброе утро". Худ.фильм.
22.55 День области.
23.05 "Умирать легко". Триллер.

ВТОРНИК, 3 августа

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.45 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 "Мио, мой Мио". Спектакль.
10.05 Мультфильмы.
10.30 "Сегодня с вами..."
11.10 Новые имена.
11.20 "Верность любви".
11.55 Третий тайм.
12.25 "А музыка звучит...
12.45 Мультфильм.
13.15 "Песню берите с собой".
14.05 Туробъектив.
14.25 Бездельник.
15.15 "Боишься ли ты темноты?"
15.40 "Механика-99".
16.15 Фестиваль народной песни.
17.15 Уроки Н.Новожиловой.
17.40 Гости в дом.
18.05 "Верность любви".
18.40 "Галерея". Док.фильм.
18.50 Новые имена.
19.15 "Алло, "Событие".
19.55 МСН.
20.15 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Женщина в белом". Худ.фильм. 2-я серия.
23.05 Криминальная хроника.
23.10 Белорусский хит-парад.
23.15 Музыкальный салон.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.30 Новости.
8.15 "Во имя любви".
9.15 Смехопанорама.
9.50 Домашняя библиотека.
10.00 "Звездные войны".
10.45 Мультсеанс.
13.30 Программа "Вместе".
14.15 "Гарри — снежный человек".
14.45 "Счастливый случай".
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 "Графиня де Монсоро".
18.15 Как это было.
18.55 "Мисс Марпл".
20.00 Время.
20.45 Комедия "Не ждали, не гадали".
22.15 "Собрание заблуждений".
22.45 "Темные небеса".

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия!
9.10 "Миледи".
10.00, 16.00, 19.00, 23.10 Вести.
15.25 Гомеопатия и здоровье.
15.30 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
16.55 "Лето нашей тайны".
18.00 Любовь с первого взгляда.
18.35 Русский бизнес.
19.45 "Горец-2" (США).
21.50 Урмас Отт с...
22.55 Дежурная часть.
23.40 Мастер-ралли-99.
23.55 Магазин на диване.

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.05 Новости культуры.
7.25 "XX век в кадре и за кадром".
8.15 "И.-С.Бах. Страницы жизни и творчества".
9.00 "Фламандские секреты". Худ. фильм.
9.55 Мир авиации.
10.20 Сальери и Моцарт от В.Крайнева.
11.05 "Московские Пенаты".
11.40 После новостей...
12.00 "Венец".
12.25 Фольклорный фестиваль.
12.40 "Российский курьер".
13.45 Возможная встреча.
14.50 М.Мусоргский. "Рассвет".
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 Мультфильмы.
16.00 "Православие на телевидении".
16.25 "Дом актера". "Дети".
16.55 "К Амалии". Романсы на стихи А.С.Пушкина.
17.10 Ортодокс.
17.40 Ноу-хау.
17.50 "Любимый город может спать спокойно..." Часть 1-я.
18.20 XXI Московский международный кинофестиваль.
19.15 Чудо-сказка.
19.50 А.Шнитке. Девятая симфония.
20.20 Коллекция.
20.35 После новостей...
20.55 "Фламандские секреты". Худ. фильм.
21.50 Док. фильм.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
7.35 Я — телохранитель.
8.10 "Солдаты удачи".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.20 "Приключения Шерлока Холмса и доктора Ватсона". "Сокровища Агры". 1-я серия.
10.40 Мультфильм
11.30 Комедия "Беспокойное хозяйство".
13.30 "Доктор Куин, женщина-врач".
14.20 Сегоднячко.
15.30 "Захватчики".
16.25 Впрок.
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" НА БТ

13.15 Тяжелый день.
13.40 Бобруйский вариант.
14.00 Мультфильмы.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Солдат удачи, ЛТД": спецназ". Телесериал.
18.20 Катастрофы.
18.45 Мультфильмы.
19.00 Служба ваших забот.
19.35 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 "Уникум". Комедия.
23.00 День области.
23.10 "В полосе прибоя". Драма.

СРЕДА, 4 августа

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.05 Новости.
8.00 "Алло, "Событие".
8.40 Потребительская корзина.
9.10 "Вас вызывает Спортландия".
10.05 "Земляки".
11.15 Новые имена.
11.25 "Верность любви".
12.05 Компьютерный полигон.
12.30 "Поэзия души".
13.15 Видимо-невидимо.
14.25 Ток-шоу "Карамболь".
15.15 "Боишься ли ты темноты?"
15.40 Мультфильмы.
16.00 Короткометражный фильм.
16.30 Педагогический экран.
17.15 "А музыка звучит..."
17.40 "Судьба моя и надежда".
18.10 "Верность любви".
18.50 Новые имена.
19.15 "Сегодня с вами..."
19.40 МСН.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Кинокомедия "Супермозг".
23.25 Криминальная хроника.
23.30 Белорусский хит-парад.
23.35 Королевская охота.
